# МАТЭРЫЯЛЫ АБ ПРАЦЫ РАЁННЫХ ІНСПЕКЦЫЙ ПА СПРАВАХ НЕПАЎНАЛЕТНІХ: РЭДАКТАРСКІ АСПЕКТ

***П. П. Жаўняровіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*zhaunier62.@tut.by*

Разглядаюцца матэрыяла раённых газет, прысвечаныя дзейнасці інспекцый па справах непаўналетніх. Адзначаецца агульная стылістычная зададзенасць тэкстаў, у якіх асвятляецца праца праваахоўнікаў з дзецьмі і падлеткамі, што ўчынілі правапарушэнні, з праблемнымі сем’ямі, выяўляецца прафілактычны і выхаваўчы патэнцыял публікацый. Адначасова канстатуецца афіцыйнасць многіх матэрыялаў, што не спрыяе наладжванню дыялогу з аўдыторыяй, недастатковая юрыдычная падрыхтаванасць журналістаў.

***Ключавыя словы:*** прававая журналістыка; інспекцыя па справах непаўналетніх; рэдактарскі аналіз: юрыдычная пісьменнасць.

# MATERIALS ON THE WORK OF REGIONAL JUVENILE AFFAIRS INSPECTORATES: EDITORIAL ASPECT

***P. P. Zhauniarovich***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: P. P. Zhauniarovich (zhaunier62@tut.by)*

The article deals with the materials of regional newspapers devoted to the activities of juvenile affairs inspectorates. The author notes the general stylistic setting of texts, which highlight the work of law enforcement officers with children and teenagers who have committed offenses, with families in crisis, and reveals the preventive and educational potential of the publications. At the same time, it is noted that many of the materials are too official, which does not contribute to a dialogue with the audience, and that journalists are not adequately prepared legally.

***Key words:*** legal journalism; juvenile affairs inspectorates; editorial analysis; legal literacy.

Адлюстраванне дзейнасці праваахоўных органаў стала неад'емнай часткай працы рэдакцыйных калектываў раённых газет. Асобнае (і асаблівае) месца сярод падобных публікацый займаюць матэрыялы, прысвечаныя працы раённых інспекцый па справах непаўналетніх (ІСН), бо не толькі ўздымаюць праблемы сучаснай вучнёўскай і працоўнай моладзі, але і садзейнічаюць прафілактыцы правапарушэнняў, у тым ліку ў сем'ях, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Дадатковы выхаваўчы эфект, які павінен суправаджаць падобныя публікацыі, ставіць перад аўтарам складаныя задачы па канструяванні журналісцкага тэксту з выразнымі прагматычнымі і аксіялагічнымі складнікамі, што павінны сістэмна ўваходзіць у яго структуру і ненавязліва запрашаць чытача да суразмовы.

Сёння ў беларускай журналісцкай навуцы практычна адсутнічаюць даследаванні ў галіне прававой журналістыкі, няма і адпаведных спецыяльных дысцыплін на факультэце журналістыкі, што, з улікам абавязковай наяўнасці падобных матэрыялаў у СМІ, патрабуе прыняцця адпаведных захадаў. Аднак і ў замежнай журналістыцы асэнсаванне такіх публікацый вядзецца з пераменным поспехам. Як адзначае расійская даследчыца А. А. Бярэзіна, «многія класіфікацыі, прапанаваныя даследчыкамі СМІ, вольныя па змесце і моцна адрозніваюцца адна ад адной» [1, с. 144]. Прычына ў тым, што матэрыялы могуць размяшчацца, па-першае, у спецыялізаваных выданнях органаў унутраных спраў і на іх інтэрнэт-парталах, па-другое, у СМІ, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца ўладныя структуры, і ў так званай жоўтай прэсе, накіраванай на сенсацыйнасць і атрыманне даходу або таннай папулярнасці. Ды і роскід тэматыкі ад бытавых правапарушэнняў да судовых разглядаў значных спраў і аналізу прынятых парламентам законаў спараджае цяжкасці ў класіфікацыі матэрыялаў, выяўленні іх адметных асаблівасцяў. «Найбольш выніковым спосабам рэалізацыі прапагандысцкай і асветніцкай палітыкі праваахоўных органаў з'яўляецца інкарпарыраванне сваіх прэс-службаў у сістэму журналісцкага супольніцтва, правядзенне сумеснай інфармацыйнай палітыкі» [2, с. 7–8], што ў беларускіх рэаліях пакуль не рэалізавана.

Сярод матэрыялаў, прысвечаных дзейнасці раённых інспекцый па справах непаўналетніх, вылучаюцца нататкі (крымінальная хроніка), справаздачы, рэпартажы, інтэрв'ю, партрэтныя замалёўкі і нарысы. Галоўнае іх прызначэнне – асвятліць працу праваахоўнікаў з цяжкімі падлеткамі, засяродзіцца на асноўных прычынах, якія выклікаюць іх дэвіянтныя паводзіны, паказаць эфектыўнасць выхаваўчай дзейнасці

ў вучнёўскіх калектывах. Прававы аспект публікацый патрабуе ад журналіста юрыдычнай пісьменнасці, захавання нормаў закона аб СМІ ў частцы неразгалошвання матэрыялаў следчых органаў да ўступлення ў сілу рашэння суда, прытрымлівання асаблівых нормаў этыкі ў дачыненні да падлеткаў. Невыпадкова ва ўсіх публікацыях імёны і прозвішчы маладых людзей змененыя.

Паказальныя ў гэтым плане матэрыялы журналісткі газеты «Голас Сенненшчыны» Таццяны Бураковай, якая з'яўляецца і членам камісіі райвыканкама па справах непаўналетніх (КСН), курыруе сумесны праект рэдакцыі газеты і названай камісіі «Мы і нашы дзеці». Менавіта дзякуючы такому шчыльнаму ўзаемадзеянню журналіста і інспекцыі па справах непаўналетніх матэрыялы насычаны канкрэтнымі фактамі, а не агульнымі разважаннямі пра лёс нашых дзяцей: «У мэтах прафілактыкі злачынстваў і правапарушэнняў сярод непаўналетніх па ініцыятыве камісіі па справах непаўналетніх на базе сярэдняй школы № 2 г. п. Багушэўска створаны клуб "Падлетак". Узначальвае яго інспектар ІСН Дзмітрый Васільеў. Дзмітрый Міхайлавіч у мінулым годзе асабіста раскрыў два злачынствы, выявіў чатырох работнікаў гандлю, якія рэалізоўвалі спіртныя напіткі непаўналетнім, прымаў удзел у раскрыцці пяці злачынстваў па лініі крымінальнага вышуку» («ГС», 05.02.2018); «Морем слёз сопровождалось рассмотрение дела молодой многодетной мамы, младшему ребёнку которой недавно исполнилось девять месяцев. Мамаша просила не забирать детей, потому что она "осознала". Но, как выяснилось, осознание снизошло на нерадивую маму всего лишь несколько дней назад, несмотря на то, что семья с 2015 года признана находящейся в социально-опасном положении» («ГС», 27.10.2017). У першым прыкладзе журналістка ў нейтральным стылі паведамляе пра поспехі інспектара, таму што матэрыял прысвечаны 100-годдзю раённай ІСН, у другім прыкладзе асвятляе рэальную дзейнасць КСН падчас разгляду адной са спраў: дзеля дасягнення пастаўленай мэты аўтар выкарыстоўвае метафарызацыю («море слёз»), якая зрокава адлюстроўвае карціну гутаркі, словы зніжанага стылістычнага рэгістра для паказу асабістых уражанняў і пераносу іх на чытача («мамаша», «снизошло», «нерадивую»). У іншым матэрыяле журналістка апісвае адно з пасяджэнняў КСН, на якое былі запрошаны 4 падлеткі, якія ўжывалі піва ў грамадскіх месцах, і з жалем канстатуе: «пенный напиток, не только среди детей, но и среди многих взрослых, вообще не воспринимается как наносящий организму вред алкоголь, постоянное употребление которого может привести к алкоголизму, опасной и мало

излечимой болезни» («ГС», 16.08.2018). У справаздачы выяўляецца веданне журналістам наступстваў супрацьпраўных дзеянняў, на чатырох прыкладах акцэнтуецца ўвага на канкрэтных учынках, удала ўключаецца аўтарскае разважанне аб прычынах ужывання алкаголю маладымі людзьмі.

Заслугоўваюць увагі якасныя матэрыялы Святланы Шырокавай у «Віцьбічах» («Инспектор по делам несовершеннолетних: о “ершистых” подростках и нерадивых родителях», 19.02.2021); Ганны Міхайлавай у гомельскай раённай газеце «Маяк» («Журналист “Маяка” провела один день с инспектором по делам несовершеннолетних», 08.02.2020); Кацярыны Рынкевіч у «Міёрскіх навінах» («Святлана Хаданёнак з Міёр з пятага класа ведала, што будзе служыць у міліцыі», 05.03.2020); Віктара Ісаенкі ў «Светлагорскіх навінах» («Инспектор по делам несовершеннолетних Светлогорского РОВД рассказывает о работе», 03.03.2021) і іншых журналістаў.

Найбольшыя пытанні з рэдактарскага гледжання ўзнікаюць пры знаёмстве са справаздачамі, аўтарамі якіх з'яўляюцца члены асабовага складу саміх інспекцый. Такія супрацоўнікі не маюць журналісцкай адукацыі, таму часта тэксты складаюцца з набору сказаў афіцыйна-справавога стылю, так званага канцылярыту, які не садзейнічае ўсталяванню дыялогу з чытацкай аўдыторыяй. Наяўнасць сэнсавых лакун, адсутнасць логікі ў выкладанні зместу і канструяванні макраструктур, штучнае сумяшчэнне разнастайных стылістычных пластоў лексікі – характэрныя прыкметы такіх публікацый.

Узнікаюць заканамерныя пытанні: «Чым займаюцца стылістычныя рэдактары?», «Чаму не даводзяцца недасканалыя тэксты да ладу?» Па-першае, не ва ўсіх рэдакцыях раённых газет прысутнічае штатная адзінка – стыльрэдактар, часта ўся праца па рэдагаванні ўскладаецца на карэктара, у службовыя абавязкі якога не ўваходзіць сэнсавая і стылістычная праўка. Па-другое, супрацоўнікі газеты засцерагаюцца браць на сябе адказнасць па змяненні матэрыялаў, што паступілі з праваахоўных органаў. Як вынік – наяўнасць сказаў, якія цяжка назваць прыкладамі публіцыстычнага стылю: «За текущий период года на территории обслуживаемой РОВД подростками совершено 16 преступлений, что в 2 раза больше, чем в прошлом году (из них 3 в состоянии алкогольного опьянения), в совершении которых принимало участие 12 подростков в возрасте от 14 до 17 лет»; «Именно от вас [родителей] зависит, получит ли ваш ребенок справку о судимости или аттестат зрелости, новый арест или поступит в ВУЗ».

Нельга не акцэнтаваць увагу і на недахопах у публікацыях штатных супрацоўнікаў раённых газет, якія ўключаюць у свае тэксты неапрацаваныя канцылярскія выразы інспектараў, напрыклад: «Участковый инспектор ИДН Соловьёва Наталья разъяснила ученикам нормы административной и уголовной ответственности несовершеннолетних, более подробно инспектором были освещены вопросы личной безопасности подростков, где также было указано на необходимость соблюдения правил дорожного движения, правил поведения в лесу, общественных местах и на водоемах. Отдельным вопросом были разобраны проблемы компьютерной и имущественной безопасности подростков, пользующихся различными гаджетами»; «Работа с неблагополучными семьями сотрудники правоохранительных органов ведут на постоянной основе. Инспектора ИДН регулярно посещают их по месту жительства. Проводят с родителями профилактические беседы о недопустимости совершения противоправных деяний, разъясняют ответственность за совершение административных правонарушений и уголовных преступлений как ими самими, так и их детьми. Напоминают об ответственности за совершение правонарушений и преступлений в сфере семейно-бытовых отношений». Падобныя фрагменты ніякім чынам не будуць садзейнічаць усталяванню ўзаемаразумення з чытачамі і мець выхаваўчы патэнцыял, бо нагадваюць справаздачу аб правядзенні планавага мерапрыемства.

Разгледзеўшы публікацыі раённых газет, прысвечаныя дзейнасці інспекцый па справах непаўналетніх, трэба адзначыць патрэбу ў дадатковай юрыдычнай падрыхтоўцы будучых журналістаў. Відаць, надышоў час стварэння праграмы павышэння кваліфікацыі «Прававая журналістыка», у структуры якой будуць і пытанні асвятлення дзейнасці інспекцый па справах непаўналетніх. Падчас рэдактарскага аналізу ў канструяванні тэматычных матэрыялаў выяўлены шматлікія недахопы, прычына якіх бачыцца не толькі ў недастатковай лінгвістычнай падрыхтоўцы, але і ў адсутнасці юрыдычнай пісьменнасці аўтараў.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Березина Е. А*. Правовая журналистика в системе современных средств массовой информации // Вестник РГГУ. Сер. Литературоведение. Языкознание. Культурология. 2010. № 8. С. 144–152.
2. *Ширшова Т. Л*. Проблемы освещения деятельности правоохранительных органов в региональной журналистике (на примере СМИ Краснодарского края). Автореф. дис. … канд. филол. наук / 10.01.10 ; Кубанский гос. ун-т. Краснодар, 2007. 23 с.